

Марэнныя адкладанні на рачулцы Акоп ля сядзібы В. Цяпінскага

спаўзалі з гор, паглыбілі катлавіну Балтыйскага мора і рушылі на раўніны Паўночнай Еўропы. Пасля таго, як ледавік растаў, ён пакінуў мноства валуноў. Пры іх вывучэнні высветлілася, што тут у асноўным пашыраны «ўраджэнцы» Фінляндыі, Фінскага заліва, Карэліі, ваколіц Санкт-Пецярбурга.

Адзін з самых вядомых камянёў Чашніцкага раёна знаходзіцца на З ад Лукомскага возера. За 1,3 км на Пд ад в. Гогалеўка, у лесе, на схіле невысокай грады выступае наздраватая камлыга. Жыхары суседніх вёсак называюць камень Змеевым, а ўрочышча — Змееўка. У Змеева каменя значныя памеры: даўжыня да 10 м, таўшчыня — 3—4 м. Ён бокам, нахіленым пад вуглом 40°, выходзіць са схілу грады. Порыстая парода падобная на бетон. Геолагі далучаюць такія ўтварэнні да кангломератаў. Гэта не валун, але з'яўленне каменнага блока звязана з ледавіковай дзейнасцю. У гэтым месцы распаўсюджана канцавая марэна апошняга на тэрыторыі Беларусі ледавіка. Сюды ён «дапоўз» са Скандынавіі каля 20 тыс. гадоў таму. Пад уздзеяннем ледавіковага наступу парушылася заляганне пластоў пяску і жвіру, талыя воды, насычаныя карбанатным рэчывам, сцэментавалі пясчана-жвіровыя адклады да стану кангламерату. Менш устойлівы матэрыял пазней быў часткова змыты са схілу грады, больш трывалы, нібы прыпаркаваны блок кангламерату захаваўся.

Дарэчы, паводле асаблівасцей залягання Змеева каменя вызначылі, што ў гэтым месцы ледавіковыя масы ціснулі на падсцілавыя пароды, наступаючы з У на З. Ад нераўнамернай цэментацыі ў кангламераце з'явіліся невялічкія пячуркі. Асабліва шмат іх у падмурку глыбы.

Людзі знаходзяць мноства загадкавых знакаў, якія дагэтуль не могуць растлумачыць. Адзін з такіх — камень з выявай чаўна ў крушні каля в. Цяпіна. Гэты камень у нядаўнія часы прывёз у Чашнікі і паклаў на сваёй сядзібе мясцовы жыхар. Па яго расказах, адразу пасля прывозу каменя кожную ноч яму здавалася, што яго нехта душыць. Каб пазбавіцца жахаў, чалавеку параілі закапаць камень, што ён і зрабіў. Пасля гэтага ён стаў спаць спакойна. Дзе цяпер гэты камень — невядома, бо чалавек у хуткім часе памёр.

На могілках у Чашніках маецца старажытны авальнай формы камень з надпісам. Магчыма, гэта выява таго залатога чаўна часоў паганскай (язычніцкай) веры, у якім сонца кладзецца спаць, а човен плыве па сінім моры да новага дня.

*Н. Кіндзяева*